УДК 351.852/853:340(476)

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ГАЛІНЕ АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***Д. В. Герасімёнак,*** *загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, БДУКМ*

*Рэзюмэ – разглядаецца гісторыя развіцця айчыннага заканадаўства ў галіне аховы культурнай спадчыны. Асаблівая ўвага ўдзяляецца сучаснаму разуменню аксіялагічнага значэння дэфініцыі «гісторыка-культурная спадчына».*

*Resume – discusses the history of the the development of national legislation in the field of protection of cultural heritage. Particular attention is paid to the modern understanding of the axiological meaning of the definition of «historical and cultural heritage».*

**Уводзіны.** Цікавасць да аховы гісторыка-культурнай спадчыны (перш за ўсе антычнай) можна прасачыць з эпохі Адраджэння. Першапачаткова гэта была грамадская дзейнасць заможных слаеў насельніцтва, якая грунтавалася на індывідуальным жаданні захаваць помнікі гісторыі і культуры для будучых пакаленняў. Назапашаны вопыт знайшоў адлюстраванне пры распрацоўцы дзяржаўнай палітыкі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў пазнейшыя часы.

**Асноўная частка.** Першая спроба заканадаўча акрэсліць пытанні аховы помнікаў даўніны была зроблена ў 1791 г. у Францыі, калі помнікі гісторыі і культуры былі абвешчаны ўсенароднымі каштоўнасцямі. У XIX ст. меры па ахове помнікаў гісторыі і культуры былі ўведзены ў многіх еўрапейскіх краінах.

Заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны БССР як сістэма прававых норм пачало фарміравацца пасля рэвалюцыі 1917 г. У перыяд савецкай дзяржаўнасці ахова помнікаў рэгулявалася саюзным (1922–1991 гг.) і рэспубліканскім заканадаўствам аб культуры. Беларускае заканадаўства па ахове спадчыны развівалася ў агульным рэчышчы дзяржаўна-прававой палітыкі, якая ажыццяўлялася ў СССР.

У 1920-я гг. задача выяўлення і ўліку манументальных помнікаў, прадметаў даўніны і мастацтва ставілася перад краязнаўчымі гурткамі і грамадскімі арганізацыямі. Менавіта на гэтым этапе былі закладзены асновы дзяржаўнага ўліку аб’ектаў гісторыі і культуры Беларусі [1, с. 21].

Першым беларускім законам, які датычыўся пытанняў аховы культурных каштоўнасцей, аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, быў Закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры» ад 26 снежня 1969 г. У значнай ступені асноўныя яго палажэнні захаваліся ў Законе БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» ад 14 ліпеня 1978 г. Згодна з заканадаўствам, вылучаліся наступныя віды помнікаў:

гісторыі, археалогіі, горадабудаўніцтва і архітэктуры, мастацтва і дакументальныя. Асаблівасцю нарматыўных прававых актаў была іх накіраванасць на абарону асобных помнікаў гісторыі і культуры, асабліва рэвалюцыйнага значэння, а не гісторыка-культурнай спадчыны ў цэлым. Аксіялагічны змест паняцця «спадчына» не ўлічваўся савецкім заканадаўствам. Паняцце «помнік гісторыі і культуры» выхоўвала абыякавасць да гісторыка-культурнай спадчыны.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь пачаўся новы перыяд у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Прыняцце Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» ад 13 лістапада 1992 г. паклала пачатак канцэптуальна іншаму падыходу да ахоўнай дзейнасці дзяржавы ў гэтай галіне. Законам скасаваны падзел помнікаў па відах, усе аб’екты аб’яднаны агульным паняццем «гісторыка-культурная спадчына», пад якой разумеецца «сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях» (глава 4, артыкул 1). У гэтым вызначэнні ўлічваецца аксіялагічны аспект.

20 ліпеня 2016 г. прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, які ўступіў у сілу 3 лютага 2017 г. У Кодэксе аб’яднана ўся нарматыўна-прававая база ў сферы культуры. Глава 16 (артыкулы 82–122) прысвечана пытанням аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Згодна з артыкулам 1 Кодэкса, *гісторыка-культурная каштоўнасць* – «культурная каштоўнасць, якая мае адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці»; *культурная каштоўнасць* – «створаныя (пераўтвораныя) чалавекам або цесна звязаныя з яго дзейнасцю матэрыяльны аб’ект і нематэрыяльнае праяўленне творчасці чалавека, якія маюць гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае значэнне» [2, с. 4]. Такім чынам, у вызначэнні падкрэсліваецца, што гісторыка-культурная спадчына з’яўляецца праяўленнем гісторыі, культуры і духоўнай творчасці беларускага народа, а значыць і агульнанароднай каштоўнасцю. Адсюль вынікае неабходнасць яе аховы.

**Заключэнне.** Распрацоўцы айчыннага заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны папярэднічаў доўгі працэс вывучэння і папулярызацыі сведчанняў мінулых эпох, які быў непарыўна звязаны з краязнаўчым рухам, музейнай дзейнасцю. У беларускім заканадаўстве гісторыка-культурнай каштоўнасцю прызнаюцца аб’екты, якія валодаюць сукупнасцю прыкмет – гістарычнай, культурнай і мастацкай значнасцю, што дазваляе іх аднесці да гісторыка-культурнай спадчыны.

## ЛІТАРАТУРА

1. Мартыненко, И. Э. Понятие и состав историко-культурного наследия Республики Беларусь / И. Э. Мартыненко // Культура: управление, экономика, право. – 2014. – № 3. – С. 20–26.

2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры: уступ. у сілу з 3 лютага 2017 г. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.